# ІНАВАЦЫІ І ТРАДЫЦЫІ Ў СФЕРЫ ДУХОЎНА-МАРАЛЬНАГА ВЫХАВАННЯ МОЛАДЗІ (на базе работы школьнага гісторыка-краязнаўчага музея)

**А. К. Пахвалёная,** *кіраўнік музея гімназіі № 25 Заводскага раёна г. Мінска, выкладчык беларускай мовы і літаратуры*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Грамадзянска-патрыятычнае выхаванне моладзі немагчыма без паўнавартаснай краязнаўчай работы. Ідэя выкарыстання краязнаўчага матэрыялу ў вучэбна-выхаваўчым працэсе выказвалася многімі вядомымі педагогамі. Неабходнасць увядзення элементаў краязнаўства ў школьнае навучанне адстойваў яшчэ К.Д. Ушынскі. Сапраўды, веды па гісторыі і культуры роднага краю садзейнічаюць больш трываламу засваенню гістарычных падзей і паспяховаму вырашэнню многіх выхаваўчых задач.

Краязнаўчая дзейнасць у гімназіі №25 г.Мінска сканцэнтравана вакол гісторыка-краязнаўчага музея, створанага 25 гадоў таму назад. Галоўнае ў паўсядзённай працы музея – гэта правядзенне экскурсій і іншых форм масавай работы. Як і ва ўсіх музеях установ адукацыі, мы праводзім аглядныя і тэматычныя экскурсіі. Пры гэтым падтрымліваецца высокі тэарэтычны і метадычны ўзровень гэтых мерапрыемстваў, адзначаюцца актуальнасць і займальнасць іх, апора на экспазіцыю і матэрыялы музея, улічваюцца ўзрост, інтарэсы і веды ўдзельнікаў.

Праекты, тэматычныя экскурсіі, акцыі, конкурсы, праграмы – гэта не інавацыі музейнай педагогікі, а яе неад'емная частка. Мінулі тыя часы, калі школьнікі прыходзілі ў музей дзеля таго, каб паглядзець на экспанаты і паслухаць экскурсавода. Новы час патрабуе новых падыходаў. І поспех тут залежыць ад ініцыятыўнасці, фантазіі кіраўніка школьнага музея.

У апошнія гады сумесная работа гімназіі і музея ў выхаванні маладога пакалення выйшла на больш якасны ўзровень.

Музей рэгулярна наведваюць не толькі гімназісты, але і вучні школ раёна і горада, знакамітыя людзі рэспублікі.

У нашым музеі тэматычныя экскурсіі ўключаюць прагляд мультымедыйных прэзентацый і відэафільмаў на пэўную тэматыку. Інфармацыйныя тэхналогіі аказваюць на практыцы неацэнную дапамогу ў вырашэнні гэтай задачы.

Дзякуючы ўдзелу ў рэспубліканскай акцыі «Жыву ў Беларусі і тым ганаруся», намі распрацаваны экскурсіі-спектаклі «Куфры – жыццё чалавечае», «Крылы ільняныя – ручнікі», «Мая незабыўная, мая 25-я», «Ад прадзедаў спакон вякоў нам засталася спадчына», «Таямніцы малой радзімы».

Зусім нядаўна мы даведаліся аб адной асаблівасці музейнай педагогікі ў Японіі: там экскурсія прысвячаецца адной рэчы. У педагагічнай гімназіі гэты падыход мы апрабавалі на 21 рэчы. «Экскурсія адной рэчы» – такая назва нашай тэматычнай экскурсіі. Наведвальнікі музея знаёмяцца з гісторыяй з'яўлення, выкарыстання, відамі і пераўтварэннямі экспаната не толькі праз паведамленне экскурсавода, але і праз прагляд мультымедыйнай прэзентацыі. Яна дае магчымасць ілюстраваць аповед экскурсавода, што робіць экскурсію больш інфарматыўнай і займальнай.

Выкарыстоўваюцца ў рабоце музея і інтэрактыўныя формы. Калі ў большасці экскурсій роля ў слухачоў пасіўная, то ў час правядзення экскурсіі, напрыклад, «Цуды музея» дзеці маюць магчымасць паспрабаваць сябе ў ролі гаспадароў: прасуюць бялізну прасамі (якія стаяць на прыпечку, награваюцца вуголлем, што бярэцца з печы), а таксама з дапамогай валкаў і качалак; важаць на бязмене, прайграваюць вінілавыя пласцінкі на патэфоне; уяўляюць сябе ў ролі барабаншчыка і гарніста – барабаняць на барабане і іграюць на піянерскім горне. Такім чынам, музей становіцца месцам, дзе забавы сумяшчаюцца з пазнаннем, месцам, якое дапамагае па-новаму паглядзець на рэчы.

Навучэнская моладзь супрацоўнічае з гарадскім і рэспубліканскім цэнтрам турызму і краязнаўства. У прыватнасці, у Палацы Рэспублікі ў мінулым навучальным годзе, дзе адбыўся жніўеньскі форум, і ў СШ № 162 была наладжана этнаграфічная выстава «Сялянскае падвор'е», «Крылы ільняныя – ручнікі», «Ад дабра ў полі – да хлеба на стале», на якой наведвальнікі змаглі пазнаёміцца з вынікамі работы музея.

У гэтым навучальным годзе мы прынялі ўдзел у выставе «Вялікі перапынак», наладжанай Беларускім дзяржаўным музеем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны напярэдадні Дня ведаў, прысвечанай школьнай атрыбутыцы мінулага стагоддзя.

З 16 па 18 сакавіка 2011 г. у нацыянальным выставачным цэнтры «БелЭкспа» праходзіла выстава навукова-метадычнай літаратуры і педагагічнага вопыту «Грамадзянска-патрыятычнае выхаванне: вопыт і перспектывы», падчас якой падводзіліся вынікі па

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

грамадзянска-патрыятычным выхаванні маладога пакалення. На ёй дэманстраваліся не толькі навіны навукова-метадычнай літаратуры і педагагічнага вопыту, але і практычныя вынікі работы з навучэнцамі ў розных гуртках і клубах. Так, ля стэндаў, дзе размясціліся вядучыя рэспубліканскія ўстановы пазашкольнай адукацыі і выхавання, можна было сустрэць юных ткачых з гімназіі № 25 Лізавету Кашэўскую і Анастасію Размысловіч у нацыянальных строях: дзяўчыны раскрывалі наведвальнікам сакрэты стварэння ручнікоў, посцілак.

На базе гімназіі № 25 дзейнічае музейнае аб'яднанне (МА), у склад якога ўваходзяць 14 кіраўнікоў музеяў Заводскага раёна. Яно садзейнічае стварэнню спрыяльных умоў для бесперапыннай адукацыі ўдзельнікаў МА, павышэння іх прафесійнага майстэрства, служыць узбагачэнню і развіццю творчага патэнцыялу кожнага педагога-музейшчыка.

Асноўныя функцыі МА: аказанне практычнай і інтэлектуальнай дапамогі кіраўнікам музеяў, падтрымка педагагічнай ініцыятывы інавацыйных працэсаў, наладжванне і ўсталяванне кантактаў, сувязей паміж раёнамі.

На базе музея гімназіі існуе таксама краязнаўча-этнаграфічнае навуковае грамадства. Менавіта праз заняткі па краязнаўстве і этнаграфіі ў нашых вучняў расце цікавасць да роднага краю, да спадчыны народа, а значыць, і адказнасць за свой край, яго гісторыю.

Вучні гімназіі прымаюць актыўны ўдзел у рэспубліканскай акцыі «Жыву ў Беларусі і тым ганаруся», якая мае добрыя вынікі. Так, Ганна Трафімава за даследчую работу «Мая незабыўная, мая 25-я» атрымала дыпломы І ступені на гарадскім і рэспубліканскім конкурсах; Лізавета Кашэўская і Анастасія Размысловіч прынялі ўдзел у аглядзе-конкурсе этнаграфічных музеяў адукацыі «Ад прадзедаў спакон вякоў нам засталася спадчына» і ўзнагароджаны дыпломамі І ступені на гарадскім і рэспубліканскім конкурсах («Настаўніцкая газета», 2011, 6 лют.).

У конкурсе на лепшы летапіс населенага пункта Аляксандр Юшкевіч і Вікторыя Ніканові у гэтым навучальным годзе атрымалі дыплом ІІ ступені і сталі лаўрэатамі рэспубліканскага конкурсу; Ганна Чарняўская, Лізавета Іонава, Анастасія Лявіцкая (8 «Г» клас) узнагароджаны дыпломам І ступені ў навукова-даследчым конкурсе «Таямніцы малой радзімы», а Аляксандра Безмен (8 «В» клас) – дыпломам лаўрэата гарадскога конкурсу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асобнай гаворкі заслугоўвае вопыт работы па выкарыстанні краязнаўчага матэрыялу на ўроках. У школьным музеі пастаянна праводзяцца ўрокі па гісторыі, грамадазнаўстве, выяўленчым мастацтве, беларускай мове і літаратуры, працоўным навучанні. Вельмі часта ўрокі праходзяць у музеі. Дзеці з цікавасцю дазнаюцца пра тое, як жылі іх дзядулі і бабулі, якімі прыладамі працы карысталіся, у што апраналіся. Так, пры напісанні, напрыклад, сачыненняў на тэмы «Беларуская хата» ці «Стэнды музея расказваюць...» вучні, пазнаёміўшыся з унутраным выглядам хаты, убачыўшы прылады працы, прадметы побыту, слухаючы экскурсавода і занатоўваючы назвы рэчаў, гісторыю іх стварэння, гаспадарчае прызначэнне кожнай з іх, значна лепш пішуць работы. Яны замалёўваюць у сваіх сшытках выгляд хаты ў цэлым, фантазіруюць, хто гаспадары гэтай хаты, якія залатыя рукі ў гаспадыні, гаспадара і г.д. У музеі ёсць магчымасць дэталёва дазнацца, якая рэч адкуль трапіла, якое яе прызначэнне. А галоўнае – выхоўваецца пачуццё павагі да працы стваральнікаў музея, жаданне самім нешта знайсці ў час канікул, прынесці ў беларускую хату.

Весь некалькі прыкладаў з сачыненняў вучняў: «Мне вельмі спадабаўся куток, дзе прадстаўлена беларуская хата. Ён нагадвае мне хату ў вёсцы, дзе нарадзілася мая бабуля і дзе я бываю кожнае лета. У нас ёсць такія ж чыгункі, збаночкі, чапяла, у куце вісіць абраз і ручнік. Я хачу знайсці на гарышчы старадаўнюю рэч і прынесці яе ў музей» (У. Шымановіч, 6 «В»).

«Я раскажу вам пра экспанат, які я прынёс у музей. Гэта мужчынская школьная форма, якую насілі яшчэ ў СССР. Гэта форма майго любімага бацькі, ён насіў яе, калі яму было толькі 10 гадоў. Калі я заходжу ў музей, я разглядваю кожны экспанат і ўспамінаю свайго бацьку. Вельмі хочацца апынуцца ў тых часах» (А. Малянец, 6 «В»).

«Я прынесла вялікую падкову. Мне яе перадаў тата, а яму – яго дзядуля. Тата расказваў мне пра яе, што гэта шчаслівая падкова, калі яна вісіць над дзвярыма, то ў хаце заўсёды будуць яснае сонейка, шчасце і радасць. Я рашыла падзяліцца шчасцем з музеем (А. Кораб, 6 «В»).

«Мае верацёны знайшлі свой пакой у музеі, цяпер я спакойны за іх захаванасць. І ўсё-такі, як прыемна аддаць тое, што табе так люба, у музей» (Д. Гаджыеў, 6 «В»).

Цікавасць уяўляюць і вершаваныя радкі, прысвечаныя музейным экспанатам:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У нас ёсць у гімназіі музей незвычайны –
«Невычэрпная крыніца гісторыі» ён.
Мы вас запрашаем у мір той цікавы.
Глядзіце які ён! Прыгожы? А то ж!

Сюды экспанаты прывозілі дзеці,
Што ў вёсцы яны выпадкова знайшлі
У куфры, у пуні, у вазніцы, у клеці,
У хляве, на гарышчы і нават у зямлі.

І вось цяпер гэтыя лыжкі і лапці,
Кашулі, качэргі, збаны, ручнікі…
Іх на паліцы ў парадку паставілі,
Паказваюць людзям побыт былы.

З выкарыстаннем матэрыялаў музея праходзяць вечарыны, святы, класныя гадзіны і гадзіны інфармавання па розных тэмах. Краязнаўчыя матэрыялы з’яўляюцца выдатным сродкам актывізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў і канкрэтызацыі агульнагістарычных падзей. Вельмі важна, каб музей удзельнічаў у вырашэнні вучэбных і выхаваўчых задач установы адукацыі, а гэта звязана з уменнем гарманічна аб'яднаць вучэбную і выхаваўчую работу, падпарадкаваць іх галоўнай мэце – фарміраванню асобы, арганічна ўключыць музей у вучэбна-выхаваўчы працэс. Краязнаўства нясе ў сабе невычэрпныя магчымасці духоўнага ўзбагачэння моладзі, культурныя здабыткі мінуўшчыны фарміруюць пачуццё патрыятызму і нацыянальнай самасвядомасці.

Навучаючы сучасных школьнікаў, вельмі важна не спазніцца ў паведамленні звестак, якія спатрэбяцца ім у дарослым жыцці і з якімі трэба ў любым узросце па-грамадзянску і па-чалавечы годна пачуваць сябе на зямлі продкаў, даражыць яе гісторыяй, культурай, мовай, думаць пра будучыню краіны. Гэтаму спрыяюць факультатыўныя заняткі на базе музея, змест якіх яднае, убірае ў сябе крылатая, любімая беларусамі, Коласава паэтычная фраза «Мой родны кут...». Факультатыў удала спалучаецца з урокамі гісторыі, геаграфіі, беларускай мовы і літаратуры, паколькі найперш яны забяспечваюць радзімазнаўчы змест навучання.

У гэтым навучальным годзе аўтар гэтага артыкула праводзіць факультатыў «Каляндарна-абрадавая паэзія» на базе музея. Заняткі факультатыва пасля вывучэння свят былі абагульнены ў форме

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

навукова-практычнай канферэнцыі «Кола года». У так званай абароне праектаў, павінен утрымліваецца наступны матэрыял:

– назва свята, што з ім звязана;

– адметнасць яго святкавання (абрады, гульні, дзействы і інш.);

– песні, якія выконваюцца падчас святкавання;

– ілюстрацыі да свята;

– адметнасць правядзення святочных мерапрыемстваў у пэўнай мясцовасці.

Вучні па чарзе расказваюць пра адно са свят. Лепшыя выступоўцы становяцца экскурсаводамі па музеі.

Паўнавартасным памочнікам з’яўляецца музей пры правядзенні ўрокаў ведаў, урокаў мужнасці, дня гімназістаў. Урокі мужнасці праходзяць не толькі ў сценах гімназіі, але і ў Доме літаратара, з якім цесна супрацоўнічае гімназія.

Першага верасня праводзілі гасцявы ўрок у майстэрні народнага мастака Беларусі, прафесара, кавалера ордэна Францыска Скарыны Данцыга Мая Вольфавіча.

Важнае месца ў музеі займае работа над зменнымі экспазіцыямі да знамянальных дат. 2012 год незвычайны. Ён аб’яўлены годам кнігі. Сімвалічна, што іменна ў гэты год адзначаецца 130 гадоў з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа, 100-годдзе з дня нараджэння Максіма Танка. У рабоце па пошуку экспанатаў для такіх зменных выстаў прымаюць удзел як вучні і іх бацькі, так і педагогі. Былі арганізаваны выставы, прысвечаныя нашым славутым песнярам, Дню Перамогі. Да Дня настаўніка падрыхтавалі выставу школьных падручнікаў розных гадоў, атрыбутаў школьнага жыцця канца XIX – пачатку XX ст.

Вынікам работы МА стала правядзенне краязнаўчых чытанняў на базе Заводскага і Савецкага раёнаў. Краязнаўчыя чытанні – гэта своеасаблівае падвядзенне выніку велізарнай і карпатлівай працы вучняў і педагогаў за апошнія некалькі гадоў. Былі арганізаваны чатыры секцыі.

Работа секцыі № 1 праводзілася ў форме кастынгу экскурсаводаў школьных музеяў. Навучэнцы-экскурсаводы прадстаўлялі завочную экскурсію па музеі ўстановы адукацыі. Экскурсіі суправаджаліся мультымедыйнай прэзентацыяй, адбываліся ў выглядзе пастаноўкі з выкарыстаннем экспанатаў музея.

У секцыі №2 навучэнцы паказвалі вынікі даследчай працы краязнаўчай скіраванасці ў форме справаздачы, якая суправаджалася таксама мультымедыйнай прэзентацыяй. Працы былі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прысвечаны даследаванню гісторыі, культуры, традыцый, экалогіі краю. У рабоце прынялі актыўны ўдзел усе ўстановы адукацыі раёнаў.

Вынікі даследаванняў, праведзеных у рамках акцыі «Жыву ў Беларусі і тым ганаруся» адзначаліся ў секцыі № 3. Былі прадстаўлены працы, рэалізаваныя за перыяд 2009/2010–2011/2012 навучальных гадоў.

Секцыя № 4 праводзіла майстар-клас творчых калектываў (гурткоў, факультатываў) па вывучэнні традыцыйных беларускіх рамёстваў.

Краязнаўчыя чытанні паказалі актывізацыю даследчай дзейнасці навучэнцаў у сферы краязнаўства, прыцягнулі ўвагу грамадскасці да вывучэння беларускай мовы, нацыянальных рамёстваў, звычаяў, традыцый, абрадаў. Спадзяёмся, што краязнаўчыя чытанні стануць традыцыйным святам культуры навучэнцаў і педагогаў раёнаў.

Цешыць тое, што школьнікі змаглі не толькі пазнаёміцца з працамі іншых школ, але і асабіста прыняць удзел у майстар-класах прыкладной творчасці.

Так, на базе народнага гісторыка-краязнаўчага музея «Невычэрпная крыніца гісторыі» гімназіі № 25 Мінска кіраўнік МА, настаўніца беларускай мовы і літаратуры Аліна Казіміраўна Пахвалёная сумесна з майстрам па валенні Веранікай Іванаўнай Фаміной і настаўніцай працоўнага навучання Аленай Уладзіміраўнай Зуеўскай, якая кіруе гуртком «Умелыя ручкі», правяла майстар-клас пра старажытнае народнае рамяство шапавальства.

Улічваючы захапленне моладзі камп’ютарамі, новымі інфармацыйнымі тэхналогіямі, мы зрабілі выснову, што неабходна выкарыстоўваць патэнцыял Інтэрнэта.

Каб акунуцца ў атмасферу Вялікай Айчыннай вайны, стаць сведкам яе незабыўных падзей, сёння неабавязкова выходзіць з дому – можна проста наведаць сайт гімназіі № 25 Заводскага раёна г. Мінска па адрасе: http.VETERANI (Y).AT.TUT.BY, пазнаёміцца з кнігай памяці «І помніць свет выратаваны», з трыма яе раздзеламі: «Летапіс Вялікай Айчыннай у вучнях даваеннай 25-й школы імя А. Чарвякова» (асаблівае месца ў гэтым спісе знакамітых людзей займае Рыма Іванаўна Шаршнёва – яе імя носіць наша гімназія, – адважная партызанка), «Настаўнікі пасляваеннай 25-й школы імя Р. Шаршнёвай – удзельнікі вайны», «Жыхары Заводскага раёна – удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Кожны жадаючы можа выбраць любую з тэм і ажыццявіць віртуальную экскурсію па «Кнізе памяці» для азнаямлення з яе матэрыяламі – фотаздымкамі і адаптаваным да іх тэкстам.

Віртуальныя экскурсіі па кнізе цікавыя і пазнавальныя тым, што ваенны лёс кожнага з удзельнікаў вайны адлюстраваны праз фотаздымкі, дакументальную хроніку, асабістыя ўспаміны ўдзельнікаў вайны, урыўкі з дакументальных кніг «Шли девчонки по войне» (скл. З.В. Корж), «У вайны не жаночы твар» (С. Алексіевіч), з газет і часопісаў.

Мы супрацоўнічаем з рэспубліканскай газетай «Звязда». Менавіта «Звязда» дапамагла стварыць музей і цэлую сетку экскурсаводаў па раздзеле «Народны побыт». Дзякуючы газеце, вучні далучаюцца да нацыянальнай культуры, даведваюцца аб звычаях беларускага народа, навучаюцца традыцыйным рамёствам і сучасным відам творчасці, што дае магчымасць у будучым правільна выбраць прафесію, быць дастойнымі грамадзянамі Беларусі. У іх фарміруецца пачуццё адказнасці за захаванне і адраджэнне нацыянальных рамёстваў і традыцый свайго народа. Разам з настаўніцай па працоўным навучанні Вольгай Анатольеўнай Паўлавец і дырэктарам гімназіі, нашым навуковым кіраўніком, Таццянай Уладзіміраўнай Дымковай мы абаранілі грант па тэме «Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці ў вучняў праз далучэнне да культурнай спадчыны беларусаў». Напрацоўкі газеты «Звязда» былі для нас вельмі добрай падмогай.

Наша гімназія цесна супрацоўнічае з праваслаўным прыходам «Благавешчанне Святой Багародзіцы». Сярод шматлікіх экспазіцый прыцягвае ўвагу куток па спецыяльнай галіне гістарычных ведаў «Царкоўнае краязнаўства», дзе знаходзяцца старажытная ікона, пакрытая даматканым белым ручніком, распяцце Збавіцеля, складзень трохстворкавы, урывак з кнігі Бібліі, каляндар 1905г., у якім змешчаны звесткі аб грамадскім і духоўным жыцці горада Мінска, вучнёўская кніга для навучання ў царкоўна-прыходскай школе.

Мы перакананы, што веданне гісторыі мясцовых манастыроў, цэркваў, ікон таксама неабходна вучням сёння.

Водгук пра работу музея знайшоў адлюстраванне ў артыкулах «Сучасныя падыходы да патрыятычнага выхавання моладзі на базе школьнага музея» («Пазакласнае выхаванне», 2010, № 7, 8) і «Музей мінскай гімназіі № 25 як цэнтр навучання і выхавання» («Беларускі гістарычны часопіс», 2011, № 4).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

З 12 па 14 кастрычніка ў Гродне праходзіў Першы нацыянальны форум «Музеі Беларусі». Актыўны ўдзел у ім, акрамя музеяў сістэмы культуры, прыватных і ведамасных музеяў, прынялі і музеі ўстаноў адукацыі. Усяго на форуме было прадстаўлена больш за 150 музеяў з Беларусі і 3 замежныя.

Мы ўдзельнічалі ў гэтым форуме і атрымалі дыплом лаўрэата конкурсу «Музеі Беларусі – трэцяму тысячагоддзю» ў намінацыі «Лепшы музей па арганізацыі культурна-адукацыйнай дзейнасці ў справе патрыятычнага выхавання моладзі» за фарміраванне нацыянальнай свядомасці вучняў праз вывучэнне культурнай спадчыны беларусаў сродкамі музейнай педагогікі, а таксама дыплом за ўдзел у Першым нацыянальным форуме «Музеі Беларусі».

Выкарыстанне інфармацыйных тэхналогій, інтэрактыўных формаў працы, гульняў паводле тэматыкі музея, арганізацыя зменных экспазіцый – усё гэта робіць музей цікавым і прывабным для вучняў, стварае ўмовы, якія садзейнічаюць развіццю пазнавальнага інтарэсу да гісторыі сваёй гімназіі, горада, краіны.

Зразумела, што няма і не можа быць універсальных метадаў, якія б забяспечвалі поспех кожнаму настаўніку, але нельга не ўлічваць значнасць уздзеяння матэрыялаў школьнага музея, які актыўна дапамагае прывіваць вучням любоў да роднага краю. Веды спрыяюць гонару, павазе і шанаванню традыцый свайго народа, створанай ім матэрыяльнай і духоўнай культуры, што садзейнічае квітненню роднай краіны. Школьны музей становіцца своеасаблівым цэнтрам выхавання і развіцця сучаснага школьніка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ